ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 29 (2003) ● Чацвер, 23 кастрычніка 1975 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.



15 кастрычніка ў БДУ адбыўся справаздачна-выбарны партыйны сход.

ІДЗЁМ ДА З'ЕЗДА

## АКТЫВІЗАВАЦЬ НАМАГАННІ

Пасля выхаду у свет пастановы ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 20 жніўня 1973 года «Аб далейшым развіцці вынаходніцкай справы у краіне, паляпшэнні выкарыстання у народнай гаспадарцы адкрыццяў, вынаходніцтваў і рацыяналізатарскіх прапаноў і павышэнні іх ролі у паскарэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу» у ВНУ і навукова-даследчых арганізацыях актывізавалася вынаходніцкая дзейнасць вучоных і інжынерна-тэхнічных работнікаў. Пастанова дала яснае тлумачэнне зместу і сутнасці вынаходніцкай справы, удакладніла ступені яе развіцця, абавязала увесці ва ўсіх арганізацыях і навуковых установах органы, якія арганізуюць і накіроўваюць гэтую работу.

З 1974 года вучонымі універсітэта была прароблена пэўная работа па стварэнню адпавядаючых сусветным узорам новых прылад, абсталявання, рэчываў, матэрыялаў, атрыманых у выніку выканання навукова-даследчых работ. Так, за 1974 год вучонымі універсітэта былі паданы 53 заяўкі на мяркуемыя вынаходніцтвы і атрыманы 33 станоўчыя рашэнні Дзяржаўнай навукова-тэхнічнай экспертызы. Некаторыя вынаходніцтвы з мэтай абароны іх дзяржаўнага прыярытэту і эканамічных інтарэсаў сталі патэнтавацца за граніцай. У 1974 годзе дацэнтам В. Ф. Стэльмахам і навуковым супрацоўнікам М. Х. Ксенафонтавым была пададзена заяўка на адкрыццё, па якой у Дзяржаўным камітэце Савета Міністраў СССР па справах вынаходніцтваў і адкрыццяў атрымана прыярытэтная даведка.

Аднак з-за таго, што вынаходніцкай работай пасур'ёзнаму займаліся не ўсе калектывы кафедр і навуковых устаноў, вынікі 1974 года па вынаходніцкай дзейнасці універсітэта у параўнанні з іншымі ВНУ БССР былі нізкімі.

Пасля правядзення арганізацыйнай і навукова-метадычнай работы рэктаратам і сектарам вынаходніцкай і патэнтнай работы універсітэта па развіццю вынаходніцкай творчасці вучоных універсітэта у 1975 годзе атрыманы лепшыя вынікі. Так, за 9 месяцаў 1975 года лік калектываў кафедр і навуковых устаноў, удзельнічаючых у вынаходніцкай рабоце, павялічыўся у 1,5 раза. За гэты ж перыяд пададзена звыш 90 заявак на мяркуемыя вынаходніцтвы і яшчэ рыхтуецца каля 20 заявак. Вучонымі універсітэта за гэты ж перыяд атрымана 34 аўтарскія пасведчанні, за якія выплачана 3 тыс. 500 рублёў заахвочвальнай узнагароды. Некаторая частка вынаходніцтваў укараняецца у народную гаспадарку ці ужо укаранёна. Аднак гэта работа праводзіцца яшчэ не на дастаткова высокім узроўні.

Добра папрацавалі у гэтым годзе вучоныя кафедр радыёфізікі і электронікі ЗВЧ, электронна-матэматычных машын, спектральнага аналізу і ядзернай фізікі фізічнага факультэта, агульнай неарганічнай хіміі, хіміі высокамалекулярных злучэнняў, фізічнай і калоіднай хіміі хімічнага факультэта, кафедры і праблемнай лабараторыі мікрабіялогіі біялагічнага факультэта, большасці лабараторый НДІ ПФП, ВЦ.

Астатнія калектывы кафедр і навуковых устаноў прыродазнаўча-тэхнічнага профілю, якія займаюцца распрацоўкай прыкладных навукова-даследчых работ, яшчэ недастаткова праявілі сябе у вынаходніцкай сферы.

Актыўна удзельнічаюць у вынаходніцкай рабоце у гэтым годзе прафесары Л. В. Валадзько, А. Ф. Чарняўскі, Д. С. Умрэйка, С. С. Сушкевіч, Ю. К. Фамічоў, А. А. Вечар, В. В. Свірыдаў, І. Г. Цішчанка, дацэнты В. Ф. Стэльмах, Г. А. Браніцкі, А. Д. Пешчанка, В. І. Лаўрукович, загадчыкі лабараторый і сектараў І. А. Малевіч, Г. П. Шпенькаў, Л. П. Рогач, навуковыя супрацоўнікі С. К. Банькоўская, Д. Д. Грыншпан, В. І. Козусь, А. П. Грышановіч, Т. П. Машэрава, І. А. Лукашык, А. Н. Сельскаў і многія іншыя.

Можна з упэўненасцю сказаць, што навукова-педагагічны састаў калектыву універсітэта да XXV з'езда КПСС даб'ецца яшчэ больш высокіх вынікаў у вынаходніцкай дзейнасці і з гонарам выканае узятыя павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы.

**М. ЛЯПІЛА,**
**загадчык сектара вынаходніцкай і патэнтнай работы БДУ.**

БДУ—НАРОДНАЙ ГАСПАДАРЦЫ

## ПРАДСТАЎЛЕНА НА ВДНГ БССР

Камплект датчыкаў плюс канструкцыя, якая друкуе лічбы, — як бачна, пералічыць кампаненты прылады «Экспрэс» няцяжка. Хутка год, як яе узор прыняты у доследную эксплуатацыю на пункце аховы здароўя лакаматыўнага дэпо станцыі «Мінск» беларускай чыгункі. З дапамогай «Экспрэса» за дзве хвіліны можна адначасова змераць артэрыяльны ціск, частату пульса і тэмпературу цела чалавека. Прылада выгадна адрозніваецца ад сваіх папярэднікаў — узораў для вымярэння ціску, частаты пульса і тэмпературы цела, распрацаваных раней Усесаюзным НДІ медыцынскай тэхнікі. Каштоўнасць «Экспрэса» — у комплексным вымярэнні чатырох параметраў, прадстаўленні вынікаў вымярэння у лічбавай форме, аутаматычным вывядзенні даных на лічбадрук. Новая прылада дае магчымасць рэгістрацыі, акрамя вынікаў вымярэння, і іншых даных: узросту чалавека, нумара медкарты, даты і г. д.

Прылада, створаная у аддзеле вылічальнай тэхнікі ВЦ БДУ, у нашай краіне не мае аналогаў. Аддзел, якім кіруе Міхаіл Канстанцінавіч Яфімчык, займаецца распрацоўкай радыёэлектроннай сістэмы збору і апрацоўкі біямедыцынскай інфармацыі. Хаця «Экспрэс» зроблены спецыяльна для перадрэйсавага агляду машыністаў цеплавозаў, ён мае відавочную будучыню. Прылада стане нязменным памочнікам медработнікаў пры масавых аглядах насельніцтва. Тэхніка, як вядома, ніколі не «стамляецца». Акрамя гэтага, гадавая эканомія за кошт скарачэння часу медыцынскага агляду складае прыкладна дваццаць тысяч рублёў.

«Экспрэс» будзе прадстаўлены на ВДНГ БССР.

**С. УСЦІНОВІЧ.**



У навуковай чытальнай зале.

Народны кантроль

НА усіх этапах сацыялістычнага і камуністычнага будаўніцтва у нашай краіне Камуністычная партыя нязменна кіруецца ленінскімі указаннямі аб тым, што адным з важнейшых рычагоў сацыялістычных пераўтварэнняў, арганізацыі эфектыўнай сістэмы кіравання народнай гаспадаркай служыць правільная пастаноўка шырокага і пастаяннага кантролю.

У рашэнні гэтай важнай задачы вялікае месца адводзіцца органам народнага кантролю. ЦК КПСС, Савецкі урад пастаянна клапоцяцца аб павышэнні іх ролі у справе усё больш шырокага уцягнення працоўных у кіраўніцтва справамі дзяржавы і грамадства. Новым сведчаннем гэтага служыць нядаўна прынятая Цэнтральным Камітэтам КПСС пастанова «Аб партыйным кіраўніцтве органамі народнага кантролю у Латвійскай ССР».

Хоць у гэтай пастанове размова ідзе аб практыцы партыйнага кіраўніцтва дзейнасцю органаў народнага кантролю у суседняй нам рэспубліцы, але яно, безумоўна, уключае важныя прынцыповыя указанні, якія павінны быць узяты на ўзбраенне ва усіх саюзных рэспубліках, у тым ліку і у нашай

У пастанове сказана, што камітэты, групы і пасты народнага кантролю актыўна дапамагаюць партыйным і дзяржаўным органам у здзяйсненні эканамічнай і сацыяльнай палітыкі партыі, у рашэнні народнагаспадарчых задач.

Разам з тым у пастанове адзначаецца, што партыйныя арганізацыі яшчэ не у поўнай меры выкарыстоўваюць магчымасці органаў народнага кантролю для узмацнення праверкі выканання на усіх участках гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, не дабіліся, каб у іх дзейнасці паўсюдна забяспечвалася арганічнае адзінства праверкі, папярэджання і выпраўлення недахопаў.

## ПАВЫШАЦЬ ДЗЕЙСНАСЦЬ

Не усе партыйныя арганізацыі глыбока унікаюць у работу органаў народнага кантролю і нацэльваюць іх увагу на вырашэнне галоўных пытанняў.

У пастанове звернута увага на усё яшчэ нізкую дзейснасць кантролю. Праведзеныя органамі народнага кантролю праверкі у радзе выпадкаў бываюць павярхоўнымі і малаэфектыўнымі. Дзейснасць народнага кантролю нярэдка абмяжоўваецца канстатацыяй недахопаў. Мае месца захапленне колькасным бокам, у той час як эфектыўнасць кантролю вызначаецца не колькасцю праверак і прынятых рашэнняў, а дзейснымі вынікамі, паляпшэннем справы.

Вынікі дзейнасці груп і пастоў народнага кантролю часам зніжаюцца таму, што ім не ствараюць неабходных умоў для работы: іх рэкамендацыі і прапановы не атрымліваюць неабходнай падтрымкі адміністрацыі, а партыйныя арганізацыі мірацца з такім становішчам. Гэта прыводзіць да зніжэння актыўнасці у рабоце народных кантралёраў.

Не наладжаны па-сапраўднаму цесныя кантакты органаў народнага кантролю з прафсаюзнымі і камсамольскімі арганізацыямі.

У пастанове адзначаюцца канкрэтныя задачы, якія стаяць перад органамі народнага кантролю у цяперашні час. Прыняты дакумент мае вялікае значэнне у справе далейшага павышэння дзейснасці народнага кантролю у нашай краіне.

Выкананне пастановы ЦК КПСС, строгае захоўванне ленінскіх прынцыпаў кантролю і праверкі выканання дапамогуць яшчэ вышэй узняць баявітасць, мэтанакіраванасць і дзейснасць народнага кантролю.

У сувязі з гэтым неабходна у кожнай групе народнага кантролю ва універсітэце у бліжэйшы час правесці пасяджэнне народных кантралёраў і абмеркаваць пастанову ЦК КПСС. Гэта пастанова павінна быць пакладзена у аснову работы народных кантралёраў, якія закліка괿ны значна актывізаваць сваю работу, павысіць дзейснасць кантролю і тым самым садзейнічаць паспяховаму вырашэнню задач, якія стаяць перад калектывам універсітэта напярэдадні XXV з'езда партыі.

**Я. ТАГУНОЎ,**
**старшыня групы народнага кантролю БДУ.**

## САСТАЎ ПАРТЫЙНАГА КАМІТЭТА

**І. І. БЕЛЕНЬКІ** — адказны за арганізацыйна-партыйную работу.

**М. С. ГАРАШЧУК**—адказны за вучэбную работу.

**Б. М. ГЛАЗКОЎ**—адказны за абаронна-масавую работу і ваенна-патрыятычнае выхаванне.

**У. К. ДРАЧОЎ** — намеснік сакратара партыйнага камітэта па ідэалагічнай рабоце.

**Т. Я. ДУДАРАВА** — сакратар партыйнага камітэта.

**С. А. ЛЫСЕНКА** — адказная за культурна-масавую работу.

**М. А. ЛЕПЯШЫНСКІ**—адказны за вучэбную работу.

**І. В. МАРЧАНКА**—адказны за работу у інтэрнатах.

**У. А. НАВУМОВІЧ**—намеснік сакратара партыйнага камітэта па арганізацыйна-партыйнай рабоце.

**А. П. ПЯТРОЎ** — адказны за работу добраахвотнай народнай дружыны.

**А. М. РУСАКОВА**—адказная за сістэму партыйнай асветы.

**У. М. СІКОРСКІ** — рэктар універсітэта.

**А. Н. СЕЎЧАНКА**—адказны за навуковую работу.

**П. Л. САЛАЎ**—адказны за работу з замежнымі студэнтамі, арганізацыю і правядзенне сацыялістычнага спаборніцтва, работу мясцовага камітэта.

**І. С. ЦІШКЕВІЧ** — адказны за работу з маладымі камуністамі.

**А. А. ТОЗІК**—сакратар камітэта камсамола.

**В. Г. ШЛЫК**—адказная за сістэму партыйнай асветы.

**Н. М. ХАЎРАТОВІЧ** — адказная за работу з куратарамі, правядзенне палітінфармацый.

**В. Ф. ЯКУШКА**—адказная за навуковую работу.

# ВЯЛІКІМ МАГЧЫМАСЦЯМ— НАША АГУЛЬНАЯ

З ДАКЛАДА Т. Я. ДУДАРАВАЙ



НАШ сход праходзіць у дні, калі увесь савецкі народ рыхтуецца дастойна сустрэць XXV з'езд КПСС. Ва усіх кутках нашай краіны кіпіць творчая, стваральная праца. Рабочыя, калгаснікі, інтэлігенцыя змагаюцца за выкананне сацыялістычных абавязацельстваў па датэрміноваму завяршэнню дзевятага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР.

Шмат папрацавау у дзевятай пяцігодцы і калектыу нашага універсітэта, які дау за гэты перыяд народнай гаспадарцы больш 14 тысяч маладых спецыялістау і каля 500 вучоных. Зараз наш калектыу змагаецца за ажыццяуленне павышаных абавязацельствау, узятых у гонар XXV з'езда КПСС. Баявым авангардам яго з'яуляецца партыйная арганізацыя, якая налічвае у сваіх радах 1198 членау КПСС і 96 кандыдатау у члены КПСС, аб'яднаных у 21 пярвічную арганізацыю і 78 партгруп. За справаздачны перыяд партарганізацыя вырасла на 130 чалавек. Прыняты у члены КПСС 171 чалавек і кандыдатамі у члены КПСС 48. Як і раней, найбольш буйнымі арганізацыямі з'яуляюцца — арганізацыя гістарычнага факультэта, налічваючая у сваіх радах 215 чалавек, фізічнага — звыш 150, юрыдычнага — 199, АХЧ — 87, хімічнага — 80 чалавек. Палепшыуся якасны састау арганізацыі. У яе радах тры акадэмікі, шэсць членау-карэспандэнтау АН БССР і акадэміі педагагічных навук СССР, дактароу навук — 58 (быу 51), кандыдатау навук, дацэнтау — 324 (было 282), 51 аспірант і 283 студэнты.

У аснову работы парткома, партыйных арганізацый былі пакладзены рашэнні XXIV з'езда КПСС і XXVII з'езда Кампартыі Беларусі, а таксама рашэнні Пленумау ЦК КПСС і ЦК КП Беларусі, пастановы ЦК КПСС «Аб рабоце па падбору і выхаванню ідэалагічных кадрау у партыйнай арганізацыі Беларусі», «Аб становішчы крытыкі і самакрытыкі у Тамбоускай абласной партыйнай арганізацыі» і іншыя, а таксама рашэнні вышэйстаячых парторганау.

У сваёй рабоце партком улічвау крытычныя заувагі, парады камуністау, якія выказваліся на агульнауніверсітэцкіх і факультэцкіх сходах.

На пасяджэннях парткома сістэматычна абмяркоуваліся пытанні аб рабоце партбюро і партгруп. Напрыклад, «Аб рабоце партбюро хімічнага факультэта, ваеннай кафедры і НДІ ПФП», «Аб рабоце кафедральных партгруп юрыдычнага факультэта», «Аб рабоце партгрупы кафедры агульнага землязнауства геаграфічнага факультэта». Акрамя гэтага, заслухоуваліся пытанні аб становішчы аргпартработы. Такія, як «Аб практыцы размеркавання партыйных даручэнняу у партарганізацыі ІПК», «Аб практыцы падрыхтоукі і правядзення партсходау на геаграфічным і гістарычным факультэтах», «Аб становішчы партыйнай гаспадаркі і уплаце членскіх узносау у партарганізацыях факультэта журналістыкі, кафедры грамадзянскай абароны і сацыялагічнай лабараторыі» і г. д. Мы імкнуліся узмацніць кантроль за выкананнем прынятых рашэнняу.

У справаздачны перыяд палепшылася работа пярвічных арганізацый і груп. Асабліва гэта датычыцца партарганізацый фізічнага, юрыдычнага, гістарычнага, філалагічнага, механіка-матэматычнага, геаграфічнага факультэтау, ваеннай кафедры, АХЧ і іншых. У гэтым вялікая заслуга камуністау, сакратароу і членау партбюро гэтых арганізацый, якія многа часу аддаюць партыйнай рабоце.

Партком абапірауся на шырокае кола партыйнага актыву, прафсаюзны і камсамольскі актыу. Многія камуністы прыцягваліся да падрыхтоукі пытанняу, якія разглядаліся на парткоме, партсходах. Усяго было праведзена больш 50 пасяджэнняу парткома, на якіх разгледжана каля 250 пытанняу. Гэта пытанні, звязаныя з унутрыпартыйным жыццём, вучобай, навуковай і выхаваучӑй работай, дзейнасцю грамадскіх арганізацый

## ВУЧЭБНАЯ І НАВУКОВАЯ РАБОТА

Галоуная увага парткома, рэктарата, партыйных арганізацый, дэканатау і кафедрау была засяроджана на павышэнні якасці падрыхтоукі спецыялістау. Вялікую ролю у здзяйсненні гэтай задачы адыграла прадастауленае XXIV з'ездам КПСС партарганізацыям ВНУ права кантролю дзейнасці адміністрацыі. Атрымаушы яго, партарганізацыі адчулі большую адказнасць і сталі больш глыбока унікаць у пытанні арганізацыі вучэбнага працэсу, навуковай і выхаваучӑй работы. Гэтыя пытанні сталі часцей абмяркоувацца на пасяджэннях парткома, партсходах, партбюро і партгрупах. За два гады партком 13 разоу абмяркоувау пытанні, якія мелі прамое дачыненне да арганізацыі і удасканалення вучэбнага працэсу.

Улічваючы крытычныя заувагі, партком, рэктарат сумесна з партарганізацыямі, дэканатамі і кафедрамі прарабілі вялікую работу па далейшаму удасканаленню вучэбнага працэсу, па пераходу на новыя вучэбныя планы. Палепшылася матэрыяльная вучэбная база, узрасла колькасць выданых вучэбна-метадычных дапаможнікау.

Толькі за мінулы вучэбны год распрацавана і выдана 52 метадычныя дапаможнікі, у тым ліку 14 на геафаку, 10 на фізфаку, 4 на факультэце журналістыкі, 3 на кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтау і г. д. Актывізавалі сваю работу навукова-метадычныя камісіі, асабліва юрыдычнага, гістарычнага, біялагічнага факультэтау. Больш актыуна сталі уваходзіць у вучэбны працэс тэхнічныя сродкі навучання: ва універсітэце дзейнічаюць 11 лінгафонных кабінетау, клас навучаючых машын «КІСІ-5».

Ва універсітэце створана стройная сістэма палітычнай, навукова-тэарэтычнай і метадычнай вучобы навукова-педагагічных кадрау. Толькі за справаздачны перыяд прайшлі перападрыхтоуку на розных формах навучання каля 70% выкладчыкау. Звыш тысячы выкладчыкау займаюцца у тэарэтычных і метадалагічных семінарах. Многія павышаюць сваю кваліфікацыю праз дактарантуру і аспірантуру, паспяхова абараняюць доктарскія і кандыдацкія дысертацыі. За справаздачны перыяд абаранілі доктарскія дысертацыі 12 чалавек, кандыдацкія — больш 80 чалавек. Зараз са ступенямі і званнямі у нас працуюць 694 чалавекі, што складае больш 50%. Узрасла партыйная праслойка. Калі у 1965 годзе сярод выкладчыкау было 29% камуністау, то зараз — 45%. Значна павялічылася колькасць выкладчыкау-камуністау на прыродазнаучых факультэтах.

Прынятыя меры далі добрыя вынікі. Значная большасць навукова-педагагічных кадрау паспяхова спрауляецца са сваімі задачамі. Сёння з упэуненасцю можна сказаць, што выкладанне ва універсітэце вядзецца на належным узроуні.

Паляпшэнне якасці выкладання садзейнічала павышэнню паспяховасці. Абсалютная паспяховасць студэнтау дзённай формы навучання у летнюю сесію 1974—1975 навучальнага года павялічылася на 0,54% і склала 94,24% у параунанні з вынікамі летняй экзаменацыйнай сесіі 1973 — 1974 навучальнага года. Найбольш высокай паспяховасці па дзённай форме навучання дабіліся гістарычны (98,4%), юрыдычны (98,3%), геаграфічны (97,42%) факультэты.

Абсалютная паспяховасць студэнтау вячэрняй формы навучання павялічылася за гэты час на 2,3% і склала 87,6%. Найбольш высокай паспяховасці студэнтау - вячэрнікау дабіліся хімічны факультэт—93,4%, геаграфічны—92,8%, гістарычны — 91,4%. Аднак калі больш глыбока унікнуць у лічбы і прааналізаваць іх, то можна убачыць, што у радзе выпадкау не так ужо добра пастаулена справа, як гэта здаецца на першы погляд. Мы яшчэ

# З ВЫСТУПЛЕННЯЎ КАМУНІСТАЎ

**У. М. СІКОРСКІ,**
**рэктар БДУ**

Справаздачна - выбарны сход праходзіць у знамянальныя для усіх нас дні— завяршальныя дні апошняга года дзевятай пяцігодкі.

Пяць апошніх год былі часам напружанай працы. БДУ з добрымі вынікамі падыходзіць к канцу пяцігодкі. Павысілася якасць падрыхтоукі спецыялістау, узрасло майстэрства выкладчыкау. Больш шырокі размах атрымалі навуковыя даследаванні: амаль у 2,5 раза павялічылася колькасць важнейшых тэм. Прыкметныя поспехі па усіх кірунках работы, і гэта—вынік намаганняу усяго калектыву універсітэта, і у першую чаргу партыйнай арганізацыі, якая была у авангардзе усіх пачынанняу.

Падводзячы вынікі работы за апошнія два гады, мы можам адзначыць узросшы узровень усей партыйнай работы, актыунасці, адказнасці камуністау за даручаную справу.

Сёння мы на уласным вопыце бачым, якім плённым было рашэнне XXIV з'езда КПСС аб прадастауленні партыйным арганізацыям вышэйшых навучальных устаноу права кантролю дзейнасці адміністрацыі. На практыцы гэта дало магчымасць партыйным арганізацыям глыбей унікаць у пытанні вучэбнага працэсу, навуковых даследаванняу, павысіць патрабавальнасць да усіх камуністау і гэтым самым забяспечыць больш высокі узровень усёй работы калектыву.

У справаздачным дакладзе было паказана, што пытанні навуковага і ідэйнага зместу лекцый і семінарау, работы кафедр і дэканатау пастаянна абмяркоуваліся на пасяджэннях парткома. У практыку нашай работы трывала увайшлі такія новыя формы, як сумесныя пасяджэнні рэктарата і парткома, вучонага савета і парткома па праблемных пытаннях жыцця нашага калектыву. Гэта дазваляе не толькі глыбей абмеркаваць і вызначыць задачы і перспектывы, але і забяспечыць больш паспяховае выкананне прынятых рашэнняу.

Адзначаючы дасягненні калектыву, яго партыйнай арганізацыі, мы павінны памятаць і аб нявырашаных задачах. Неабходна крытычна ацаніць сваю работу, зразумець складанасць задач, якія стаяць наперадзе. Асабліва неабходна гэта зрабіць цяпер, напярэдадні XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ, якія паставяць перад намі новыя, яшчэ больш складаныя задачы.

Дзесятая пяцігодка будзе пяцігодкай якасці, а гэта значыць, што нам прыйдзецца удасканальваць усе бакі нашай дзейнасці — вучэбны, навуковы, метадычны, выхаваучӑы.

**І. П. ЗЯЦЬКОЎ,**
**дэкан фізічнага факультэта**

Наш факультэт стау пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва у 1974 годзе. У 1975 годзе калектыу факультэта паставіу перад сабой рад новых задач, узяу на сябе павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы па дастойнай сустрэчы XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ.

Калектывы кафедр факультэта — пераможцы спаборніцтва мінулага года — і цяпер дасягнулі значных вынікау. Яны праводзяць заняткі на высокім навукова-метадычным узроуні, шырока выкарыстоуваюць сувязь з вытворчасцю. Добрыя вынікі дасягнуты і у навуковай рабоце.

Вынікі комплекснай работы, якую вялі супрацоунікі кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ і кафедры спектральнага аналізу, атрымалі высокую ацэнку і удастоены Дзяржаунай прэміі БССР за 1974 год. Прэміяй Ленінскага камсамола у 1974 годзе адзначана работа супрацоунікау НДІ ПФП Дземчука і Малевіча.

Калектыу кафедры ядзернай фізікі значна удасканаліу рад вучэбных практыкумау.

Вялікую навуковую і метадычную работу праводзяць калектывы іншых кафедр факультэта: кафедры агульнай фізікі (загадчык А. М. Саржэускі), цеплафізікі (загадчык А. С. Каспяровіч), электрафізікі (загадчык А. Ф. Шылау) і многія іншыя.

Можна прывесці яшчэ многа прыкладау актыунай, творчай дзейнасці прафесарска-выкладчыцкага саставу і супрацоунікау факультэта. Але неабходна спыніцца і на недахопах, якія перашкаджаюць асноунай нашай дзейнасці — арганізацыі і правядзенню вучэбнага працэсу.

Ужо тры месяцы, як наш факультэт у асноуным пераехау у Шчамысліцу, але да гэтага часу там няма самага неабходнага — бібліятэкі. Сталовая працуе з 10 да 15 гадзін, і студэнты не могуць ёю карыстацца. Дрэнна наладжана работа транспарту, што таксама стварае вядомыя цяжкасці.

Корпус дрэнна падрыхтаваны да прыёму студэнтау: выбіта шкло, не працуюць санвузлы, гадзіннікі і званкі, не хапае мэблі.

Кафедра фізічнага выхавання да гэтага часу не вырашыла, хто будзе праводзіць заняткі з нашымі студэнтамі.

Гэтыя «дробныя» недахопы вельмі перашкаджаюць нармальнай рабоце, адцягваюць увагу дэканата ад непасрэдных спрау.

**У. А. НАВУМОВІЧ,**
**сакратар камітэта камсамола БДУ**

Камсамольская арганізацыя, усе студэнты прыйшлі да партыйнага справаздачнага сходу з новымі поспехамі у вучобе і працы. Будучыя спецыялісты добра усведамляюць сваю адказнасць перад Радзімай. Авалодваючы ведамі, яны ужо зараз вучацца служыць свайму народу, вялікай справе будауніцтва камунізму. У гэтай сувязі прывяду адзін прыклад.

У камітэт камсамола звярнуліся будаунікі нашага інтэрната № 9. Яны прасілі дапамогі, каб здаць новы інтэрнат да прыезду студэнтау з сельгасработ. Камітэт камсамола звярнууся да студэнтау V курса фізічнага факультэта. І нягледзячы на тое, што пяцікурснікі знаходзіліся тады на вытворчай практыцы, рыхтавалі дыпломныя работы, а некаторыя ужо працавалі на вытворчасці, яны кожны дзень па некалькі гадзін адпрацавалі на будауніцтве.

Першымі на заклік адгукнуліся камсамольцы 3-й групы V курса фізфака Рыжоу, Панасёнак, Баркун, Жук, Навакоускі і іншыя.

Сёння ужо каля 2 тысяч камсамольцау універсітэта абмянялі камсамольскія дакументы. Выкарыстоуваючы вопыт работы партыйнай ар-

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, ...

## «БУЛЬБЯНЫЯ» МЕМУАРЫ

# ЯК ЯНО БЫЛО...

Дзявочая брыгада з шасці чалавек працавала на уборцы бульбы камбайнам. І хоць мы рабілі усё для таго, каб сабраць бульбы больш, дзённая норма не выконвалася. І тады..

Напярэдадні вечарам мы угаварылі механізатарау пачаць работу роуна у сем гадзін замест дзевяці. Ноччу ніяк не спалася. Акрыленыя, натхнёныя, з рашучым намерам «выдаць» заутра 12 бункерау бульбы — дзённую норму — мы, нарэшце, заснулі. А раніцай...

— Колькі гадзін, Маша?

— Дваццаць хвілін восьмага, — адказала я і абамлела. А Таня ужо нацягвала боты. Вырашылі: снедаць не будзем — адразу ж на поле.

— Во, патрыётау нагадавау факультэт, — нязлосна пракаменціравала Наташа, — не паеушы працаваць бягуць.

У кухні гадзіннік паказвау палову сёмага.

— Ура! Ёсць час, яшчэ напішам плакат «Да здравствуют Толя и Лёня — главные виновники нашей победы!»

Толя і Лёня — гэта нашы механізатары. І плакат быу напісаны.

На полі дзяучаты не шкадавалі прыветнага слоуца, каб стварыць у Толі і Лёні адпаведны выпадку бадзёры настрой. А у кабіне Лёні ляжау загадкава-звычайны скрутак, аб прызначэнні якога ён і не здагадвауся. Мы ж стараліся быць вельмі пільнымі, каб не прапусціць па канвееру ніводнага каменя, якімі так шчодра было надзелена поле.

Ах, намеры-надзеі! Кажуць бабкі: не загадвай наперад — абавязкова наадварот атрымаецца.

Адным словам, план мы не выканалі. Паломкі адна за другой, простыя і складаныя, то на пяць хвілін, то на дваццаць. А сонца няумольна падымалася, і гадзіннік ахвотна пацвярджау: так-так, хутка канец вашай змены.

А дванаццатай гадзіне Лёня паведаміу:

— Адпрацаваліся. Трэба ехаць за запчасткамі...

Што мы маглі яму сказаць? Трэба дык трэба.

— Мы ж у кабіне плакат забыліся!

— Нічога. Лёню і у думкі не прыйдзе паглядзець, што у тым скрутку. Ну, не сёння, дык заутра, паслязаутра зробім норму і плакат вывесім.

На тым і вырашылі. Што ні кажыце, а мы пераскочым усемагчымыя бар'еры і дадзім 12 бункерау бульбы за змену!

**М. ШЫМКО.**





Добра папрацавалі на уборцы бульбы студэнты IV курса журфака.

Фота С. Шыдлоускай.

# ДАПАМАГЛІ САЎГАСУ

Як і усе студэнты, у верасні—кастрычніку мы былі на «бульбе». Мы — гэта 25 трэцякурснікау біялагічнага факультэта. Працаваць нам давялося у саугасе «Ніва» Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці. Вёска, у якой мы жылі, насіла некалькі неадпаведную назву — «Хутар». Саугас, як потым мы убачылі, не зусім добра падрыхтавауся да прыёму студэнтау. Але, не зважаючы на гэта, рабяты з першых дзён працавалі добра. Нашым рукам знайшлася справа і на полі, і на таку. 302 тоны бульбы убралі мы з палеткау саугаса, ачысцілі і засыпалі у засекі 1990 тон зерня, убралі караняплоды з плошчы 4,5 гектара.

Пасля працы усе збіраліся ля прыветнага кастра, дзяліліся дасягнутымі поспехамі, хвалілі перадавікоу, спрачаліся. У «маланках» і «баявых лістках не раз адзначалася выдатная праца Паула Мучакі, Жаны Шарко і іншых.

Кіраунікі саугаса высока ацанілі нашу працу. Брыгада была узнагароджана Ганаровай граматай.

**Э. ХАЦЯТОЎСКІ,**
**студэнт III курса біялагічнага факультэта.**



**Вось і лісце лягло на дарогу,**
**Шапаціць у нагах, шапаціць.**
**Ва усім свеце яго столькі многа,**
**Што няможна ніяк падлічыць.**

**Мы не бачым малюнкау чароуных,**
**Што звісаюць са стромкіх галін...**
**Але учора барвова-чырвоны**
**Ты заувважыла ліст на зямлі.**

**Колер восені разам сабраны,**
**Гэта сонцу даніна з данін.**
**Пакланяліся б цуду аддана,**
**Калі б быу на сусвет ён адзін...**

**В. ШЭФНЕР.**

**Фота С. Шыдлоўскай.**

## ЛІСТОК ДАІ

# АЎТААЮБІЦЕАЬСКІ СЕЗОН У РАЗГАРЫ

Аналіз аварыйнасці на дарогах Мінска па выніках сямі месяцау паказау, што у параунанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічылася колькасць дарожна-транспартных здарэнняу.

З пачатку бягучага года на вуліцах Мінска аутамоталюбіцелямі зроблена 106 дарожна-транспартных аварый, што складае амаль 21% агульнага ліку аварыи на дарогах. У гэтых здарэннях 15 чалавек загінула, 105 атрымалі траумы. Характэрна, што больш палавіны аутамабільных аварый—на сумленні уладальнікау першакласных машын «Жыгулі». Так, уладальнік «ВАЗа» А. Чэпік, паварочваючы з Друкарскай вуліцы на вуліцу Я. Коласа, не прапусціу аутамабіль, які рухауся насустрач у прамым кірунку. У выніку — сутыкненне, паранены пасажыр. 21 ліпеня вадзіцель «Жыгулей» С. Клімау наехау на аутобус, які прыпыніуся. Сам Клімау загінуу, пасажыр, які сядзеу у аутамабілі, цяжка паранены.

У апошні час нярэдкія і факты недысцыплінаванасці некаторых матацыклістау. Матацыклы з іх уладальнікамі 42 разы «удзельнічалі» у аварыях гэтага года. Прычыны: ліхацтва, незахаванне дыстанцыі, чарговасці праезду перакрыжаванняу. Вось прыклады:

Матацыкліст Д. Шарстабітау, рухаючыся па Партызанскаму праспекту, не разлічыу бяспечнай скорасці руху і пры паяуленні перашкоды разгубіуся, не справіуся з кіраваннем і наехау на асвяшчальную мачту. Вадзіцель і пасажыр загінулі.

Вадзіцель матацыкла У. Бабровіч на вуліцы Маякоускага не справіуся з кіраваннем і наехау на грузавік. Ад удару матацыкліст быу выкінуты на паласу сустрэчнага руху і папау пад аутамабіль. У выніку—яшчэ адна трагедыя.

Такім чынам, недысцыплінаванасць вядзе да бяды. Асабліва небяспечны за рулём аутамоталюбіцелі з невялікім вадзіцельскім стажам. Гэтыя навічкі «зрабілі» амаль трэць усіх здарэнняу на індывідуальным транспарце.

Адзначым таксама, што каля трэці вадзіцеляу, пазбауленых органамі ДАІ правоу на кіраванне машынамі у стане ап'янення, — уладальнікі асабістага транспарту!

Становішча, якое склалася, вымушае работнікау ДАІ разам з усямерным узмацненнем выхавання вадзіцеляу узмацніць захаванне імі транспартнай дысцыпліны.

Цвёрда ведаць і свядома захоуваць законы дарожнага руху — важны абавязак вадзіцеляу. І выконваць яго могуць толькі дысцыплінаваныя людзі.

**ДАІ УУС**
**Мінгарвыканкома.**

СПОРТ

# ЗАЎСЁДЫ ДАБІВАЦЦА СВАЙГО Ў ЖЫЦЦІ...

Шэры восенькі дзень. Нават на перапынках ва універсітэцкім калідоры не так шумна. Мы стаім з Таняй Косцінай каля акна і размауляем. Я разглядаю яе: невысокая чарнявая, разумныя, іскрыстыя вочы. З захапленнем яна расказвае аб сваёй групе, аб сяброуках, але з адчуваемай неахвотай гаворыць пра сябе.

Яшчэ у трэцім класе брат навучыу Таню гуляць у шахматы. Маленькай дзяучынцы гэта вельмі спадабалася, і яна, не разважаючы, запісалася у секцыю. Першым трэнерам, якога Таня з удзячнасцю успамінае і зараз, быу Л. Л. Шульгоускі. Гэта ён сваім стараннем прывіу Тані сапраудную любоу да шахмат. На працягу вучобы у школе не раз прыходзілася выступаць на спаборніцтвах за школьную каманду і за каманду Магілёва, дзе дзяучына жыла. Поспех быу спадарожнікам у выступленнях Тані: неаднаразова займала яна прызавыя месцы. Шахматы моцна увайшлі у яе жыццё. А калі пасля школы паустала пытанне, куды паступаць, быу выбраны факультэт прыкладной матэматыкі БДУ.

Зараз Таня ужо студэнтка 4 курса. Лекцыі, семінары, бібліятэка і, канешне, шахматы. Я пытаюся, ці цяжка ёй, і разумею, што задала не тое пытанне. Ці можа быць лёгка чалавеку, які вучыцца на ФПМ, займаецца шахматамі, ды к таму ж мае сям'ю! Дарэчы, і муж Тані, Валерый Чэхау, таксама шахматыст: у жніуні гэтага года у Югаславіі ён заваявау званне чэмпіёна свету па шахматах сярод юнакоу. Такім чынам, шахматы акружаюць Таню усюды. Хаця правільней будзе сказаць, што яна сама акружае сябе шахматамі. Ды інакш і нельга. Шахматы патрабуюць настойлівай і самаадданай працы. Таму кожную свабодную хвіліну спяшаецца Таня к свайму трэнеру гросмайстру І. Я. Баляслаускаму. І амаль заусёды атрымліваецца так, што вольнага часу зусім не застаецца. А калі бываюць свабодныя дні, Таня аддае іх кнігам.

Я пытаю у Тані, чым усё ж-такі з'яуляюцца для яе шахматы. Яна спачатку жартуе, а потым задумваецца. І я разумею яе. Амаль 12 гадоу заняткау шахматамі — гэта нямала. Было усё: радасці і засмучэнні, перамогі і няудачы. Шахматы — амаль палова яе жыцця. Нават і летам Таня не развітвалася з імі. У фінале спаборніцтвау па шахматах на VI Спартакіядзе народау СССР, якая адбылася у Рызе, Таня выступала за каманду рэспублікі. Яна падзяліла 1 і 2 месцы, набраушы 8 ачкоу з 9 магчымых і выканала нормы майстра спорту СССР.

...Мы развіталіся з Таняй. Напаследак яна усміхнулася мне і паспешліва пайшла па калідоры: праз некалькі хвілін пачыналіся заняткі. А я усё стаяла ля акна і думала, што, напэуна, такія людзі, як Таня, заусёды дабіваюцца свайго у жыцці, заусёды здзяйсняюцца іх мары.

**Т. ШЧОГАЛЬ.**

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Аб'ём—1,5, друк. ар.

Тыраж 2.000 экз. АТ 07422 Заказ № 1557.

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоунага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.